ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 19 (692) | Аўторак, 31 мая 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**У ДРУКУ АПУБЛІКАВАНЫ ТЭЗІСЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПСС, АДОБРАНЫЯ ПЛЕНУМАМ ЦК ПАРТЫІ 23 МАЯ 1988 Г., ДА XIX УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ. ЯНЫ ВЫНЕСЕНЫ НА ШЫРОКАЕ АБМЕРКАВАННЕ КАМУНІСТАМІ, УСІМІ ПРАЦОЎНЫМІ НАШАЙ КРАІНЫ. ТЭЗІСЫ ЦК КПСС ЗНАХОДЗЯЦЦА ЦЯПЕР У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ І ШМАТТЫСЯЧНАГА КАЛЕКТЫВУ НАШАГА УНІСЕРСІТЭТА.**

## ПАРТГРУПЫ: СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ

Для камуністаў, усяго савецкага народа сёлетні год асаблівы. Ён насычаны падзеямі, якія яркай старонкай будуць упісаны ў гісторыю краіны. Знамянальнай вяхой з'явіцца прадстаячая XIX Усесаюзная партыйная канферэнцыя. Да чарговага форуму камуністаў паўсюдна вядзецца актыўная падрыхтоўка. Шырокая дэмакратызацыя нашага ладу жыцця, галоснасць, творчасць і ініцыятыва шырокіх мас — тая платформа, на якой грунтуюцца дасягненні ў далейшым сацыяльна-эканамічным развіцці першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы.

Для камуністаў нашага універсітэта падрыхтоўка да Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі супала з правядзеннем справаздач і выбараў у партыйных групах. На сённяшні дзень на факультэтах і ў іншых структурных падраздзяленнях ГДУ іх налічваецца 36, якія аб'ядноўваюць пераважную большасць членаў універсітэцкай партарганізацыі. Справаздачы дазволілі як бы падвесці вынікі зробленага не толькі за справаздачны перыяд, але і за час, што мінуў пасля красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС, які вызначыў новыя напрамкі для далейшага развіцця ўсяго нашага сацыялістычнага грамадства. Прадставілася яшчэ адна магчымасць прынцыпова, па-дзелавому павесці размову аб тым, які ўклад у перабудову ўносіць кожны камуніст, аб першых кроках у ажыццяўленні шырокамаштабнай праграмы перабудовы вышэйшай школы.

Важна падкрэсліць, што галоўная ўвага звяртаецца не на поспехі, а на недахопы і негатыўныя з'явы, што ёсць яшчэ ў дзейнасці многіх партгруп. Праяўляецца агульная зацікаўленасць аб далейшым павышэнні якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, іх камуністычнага выхавання, усямерным нарошчванні навуковага патэнцыялу вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся, пашырэнні і паглыбленні навуковых даследаванняў, хутчэйшым і больш эфектыўным укараненні іх вынікаў у вытворчасць і іншыя сферы практыкі.

Істотнай адметнасцю справаздач і выбараў у партыйных групах стала ўзросшая актыўнасць камуністаў. Аднак не ўсе з іх ужо праніклiся сапраўднай адказнасцю за канчатковыя вынікі агульных спраў. Таму нельга мірыцца з тымі, хто, як кажуць, імкнецца схавацца за спіны іншых па прынцыпу: мая хата з краю. Надышоў час, калі кожны камуніст павінен займаць актыўную грамадзянскую пазіцыю, сваімі паўсядзённымі дзеяннямі апраўдваць высокае званне партыйца.

Справаздачна - выбарная кампанія ў партгрупах універсітэта падыходзіць да завяршэння. Яе вынікі будуць больш грунтоўна прааналізаваны на справаздачна-выбарных сходах партарганізацый структурных падраздзяленняў і універсітэта ў цэлым. Трэба дамагацца таго, каб гэтыя вынікі прынеслі ўсеагульнае задавальненне пры падрыхтоўцы да Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, дастойнай сустрэчы 70-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

## ЗАДАЧЫ СТАЯЦЬ ПЕРАД КОЖНЫМ

XIX Усесаюзная партыйная канферэнцыя, якая пачне сваю работу ў канцы чэрвеня г. г., разгледзіць пытанні, якія маюць велізарнае значэнне ў жыцці нашай краіны, у далейшым яе развіцці, руху наперад: аб ходзе рэалізацыі рашэнняў XXVII з'езда КПСС, задачах партыйных арганізацый па паглыбленню працэсу перабудовы, аб мерах па далейшай дэмакратызацыі жыцця партыі і грамадства. На канферэнцыі яе дэлегаты павядуць гаворку аб тым, што ўжо зроблена ў краіне на шляху перабудовы, што яшчэ перашкаджае ёй, і як гэтыя перашкоды ліквідаваць. Вынесеныя на ўсеагульнае абмеркаванне тэзісы — гэта платформа для дыскусіі савецкіх людзей па пытаннях перабудовы ва ўсіх сферах нашага жыцця.

Нам, работнікам вышэйшай школы, нельга было не звярнуць увагу на такія радкі тэзісаў: «Гуманістычныя прынцыпы нашай палітыкі накіраваны на забеспячэнне духоўнага прагрэсу грамадства, уздым адукацыі і культуры народа. За мінулыя тры гады ўдзялялася істотная ўвага развіццю адукацыі на розных яе ступенях і ўзроўнях. Пытанні перабудовы сістэмы народнай асветы былі разгледжаны на лютаўскім (1988 г.) Пленуме ЦК КПСС. Наша вышэйшая і сярэдняя школа ў многім адстала ад патрэбнасцей жыцця, навукова-тэхнічнага і культурнага прагрэсу. Неабходны энергічныя намаганні ўсяго грамадства, каб забяспечыць якасныя перамены ў яе развіцці».

Задача ўсіх работнікаў вышэйшай школы рабіць усё для таго, каб у ёй адбыліся якасныя змены і ў ВНУ краіны рыхтаваліся па-сапраўднаму высокакваліфікаваныя спецыялісты для ўсіх галін народнай гаспадаркі. Бо ад таго, з якім багажом ведаў прыйдзе малады спецыяліст на вытворчасць, у школы, будзе залежыць далейшы лёс перабудовы.

**В. МАНАХАЎ,**
**загадчык кафедры алгебры і геаметрыі, дацэнт.**

*ДЗЁННІК СЕСІІ*

## Пасрэдныя веды—пасрэдны спецыяліст

Майскае хараство прыроды, ласкавае і пяшчотнае сонейка не зусім настройваюць на дзелавы лад. Хочацца пакінуць неадкладныя справы, апынуцца на ўлонні прыроды, любавацца яе прыгажосцю. Але —гэта мары. Рэальнасць жа студэнцкага жыцця больш будзённая і празаічная: лекцыі, семінарскія заняткі, а ў некаторых і таго больш адказная пара — залікова-экзаменацыйная сесія. Раней, чым на астатніх факультэтах, яна пачынаецца на тых курсах геалагічнага, біялагічнага і эканамічнага факультэтаў, якія ўжо ў чэрвені пачынаюць праходзіць вучэбныя і вытворчыя практыкі.

Для чацвёртакурснікаў, трэцякурснікаў, часткі студэнтаў 2-га курса геалагічнага факультэта залікі і экзамены летняй сесіі— ужо этап завершаны. Цяпер яны праходзяць практыку па ўсёй нашай краіне, а таксама ў Гомельскай вобласці, ва ўрочышчы Чонкі.

Якія ж веды паказалі будучыя геолагі на экзаменах? Пасля дэталёвага знаёмства з тымі адзнакамі, якія паставілі ім выкладчыкі, на гэта пытанне можна адказаць адназначна — пасрэдныя. Варта дадаць таксама, што сем студэнтаў чацвёртага курса не былі дапушчаны да экзаменаў па інжынернай геалогіі і гідрагеахіміі з-за нездадзеных залікаў. Астатнія ж атрымалі на экзаменах па названых прадметах пераважна здавальняючыя адзнакі. Своеасаблівы «рэкорд» устанавілі чацвёртакурснікі, калі здавалі экзамен па геалогіі СССР — атрымалі 8 (!) двоек. Апраўданнем такога правалу не могуць служыць іх словы, што прадмет занадта складаны.

У студэнтаў трэцяга курса справы, быццам бы, крыху лепшыя. Тут пасля здадзеных экзаменаў па асновах навуковага атэізму, геамарфалогіі, гідрагеалогіі, грунтазнаўству пераважаюць добрыя адзнакі. Хаця не абышлося і без тых, каго з-за нявыкананых своечасова лабараторных работ не дапусцілі да экзаменаў па грунтазнаўству. Такіх студэнтаў аказалася чатыры.

Сур'ёзную заклапочанасць на факультэце выклікаюць другакурснікі. Яны паказалі на экзаменах велымі слабыя веды. Пацвярджэннем сказанаму могуць стаць такія лічбы: толькі тры вышэйшыя балы атрыманы пасля чатырох здадзеных экзаменаў, пастаўлена шмат здавальняючых адзнак. У некаторай ступені такое становішча на курсе можна растлумачыць тым, што тут нямала такіх юнакоў, якія працягваюць вучобу пасля службы ў радах Савецкай Арміі, і, зразумела, у іх ведах утварыліся пэўныя прабелы. Выкладчыкі, канешне, на экзаменах гэта ўлічваюць. Але ж, думаецца, на дапамогу такім студэнтам павінны прыйсці і іх аднакурснікі, каб «падцягнуць» сваіх таварышаў па вучобе.

Заўсёды павышаную цікавасць выклікаюць экзамены першакурснікаў. Гэта і зразумела: сесія, нібы люстэрка, паказвае, як змаглі адапціравацца ў студэнцкім жыцці нядаўнія школьнікі, якую дапамогу ў гэтым ім аказалі выкладчыкі. На жаль, даводзіцца гаварыць, што сёлетнія першакурснікі геалагічнага факультэта не набылі трывалых ведаў. Так, у групе Г-11 на экзамене па вышэйшай матэматыцы выкладчык не паставіў ніводнай выдатнай адзнакі, па гісторыі КПСС атрымана вялікая колькасць троек. Не лепш ідуць справы ў групе ГФ-11. Такі прадмет як гісторыя партыі тут таксама стаў для першакурснікаў «цвёрдым арэшкам»: у групе ёсць адна нездавальняючая адзнака, 10 троек.

Міжволі напрошваецца сумны вывад: узровень ведаў будучых геолагаў жадае быць значна вышэйшым. Аб гэтым на факультэце трэба задумацца ўсім.

**Т. НІКАЛАЕВА.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра філасофіі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры КРАЎЦОВУ Валерыю Іванаўну з зацвярджэннем яе ВАКам у вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук.**

✦

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра тэарэтычнай фізікі горача віншуюць старшага выкладчыка гэтай кафедры ДВОРНІКА Аляксандра Міхайлавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

✦

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры РОГАЛЕВА Аляксандра Фёдаравіча (навуковы кіраўнік — прафесар П. У. СЦЯЦКО) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

## АБ АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКІМ ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ

2 чэрвеня ў актавай зале адбудзецца агульнауніверсітэцкі адкрыты партыйны сход. На парадак дня выносяцца наступныя пытанні:

1. Аб задачах партыйнай арганізацыі універсітэта ў святле рашэнняў лютаўскага (1988 г.) Пленума ЦК КПСС.

(Дакладчык — прарэктар па вучэбнай рабоце член паркома Л. А. Шамяткоў).

2. Інфармацыя аб ходзе выканання пастаноў папярэдніх партыйных сходаў.

(Інфармацыя намесніка сакратара парткома **Г. Д. Ветлугаева**).

3. Аб правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі камуністаў.

(Інфармацыя сакратара парткома **М. І. Старавойтава**).

Пачатак партыйнага сходу — у 14.30, рэгістрацыя — з 13.45.

**ПАРТКОМ.**

